# Гісторыя маёй школы – старонка гісторыі малой радзімы

Люблю цябе, мой край Палескі,
Я сэрцам да цябе прырос…

Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гоцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа Салігорскага раёна” знаходзіцца ў аграгарадку Гоцк Салігорскага раёна – у глыбінцы беларускага Палесся, што мяжуе з Лунінецкім раёнам Брэсцкай вобласці і Жыткавіцкім раёнам Гомельскай вобласці.



**Рыс. 1. Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гоцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа Салігорскага раёна”. Выпуск 2019/2020**

Гісторыя нашага краю бярэ свае карані з глыбокай даўніны. Каля пяцісот год таму сярод балотаў і лясоў была заснавана вёсачка Старая Студня. Некаторыя людзі яе ўзнікненне звязваюць з заканчэннем нашэсця татара-мангольскага іга. Са слоў старажылаў, вёска Старая Студня была знішчана пасля падаўлення бунту пад кіраўніцтвам Пугачова, гэта значыць, у 1773-1775 г.г. А жыхары знішчанай вёскі пачалі адбудоўвацца побач і далі вёсцы назву Гоцк, бо вакол была балоцістая мясцовасць, па іншаму – гаць. Каб перайсці па балоце, масцілі гаць, кладкі якой “гоцькалі” у час удару аб ваду. Гаць – Гоцк.

Першапачаткова наша вёска складвалася толькі з дзевяці сямей. Уся яна была як бы разрэзана на дзевяць падзелаў. Раслі сем’і, расла і вёска. А паколькі зямля ў кожнай сям’і дзялілася паміж дарослымі сынамі, то з цягам часу падзелы ўсё больш драбіліся.

Так узніклі хутары Корч, Сідорава, Задуброва, Затапіло, Глушчых, Зарэчча, Замядзьведзіца, Задожнэ, Сукач, Апаліно – больш за трыццаць.

З успамінаў Ермаковіча Якава Васільевіча, 1901 года нараджэння, найстарэйшага жыхара вёскі Гоцк Мінскай губерні, Мазырскага павета, Чучавіцкай воласці у 1909 годзе нанялі ў вёску першага настаўніка са Слуцкага павета вёскі Заўшыцы Рэвута Андрэя. Ён вучыў толькі адзін год. Быў добры сталяр. Выкладаў рускую мову (“Буквар”).

У 1910 годзе нанялі з вёскі Крывічы Слуцкага ўезду маладога настаўніка Яфіма Шадурка. Працаваў таксама адзін год. Да яго вучыцца хадзілі 10 дзяцей.

У 1911 годзе прыслалі настаўніцу Чурко Аляксандру Кандрацьеўну. Школа была ў доме Ліхтара Паўла Сцяпанавіча. Ён збудаваў новы дом і аддаў яго пад школу. Сам жа пражываў у старой хаце. Тут вучыліся ў 1911-1912 гадах. Абсталяванне гэтай “школы” было дзяржаўным: парты (скамейкі), алоўкі, кнігі, дошкі, нагляднасці… Адна скамейка разлічана на чатырох вучняў. Вучыла Аляксандра Кандрацьеўна чатыры гады. Дзецям выдаваўся “Буквар” і грыфельная дошка. На ёй пісалі грыфелем, падобным на аловак, і лёгка выціралі з дошкі.  Вучыліся з 9.00 да 18.00 Заняткі праходзілі ў такім парадку: 9.00-11.00, абед з 11.00-13.00 гадзін, з 13.00 да 18.00 – працяг заняткаў. Да 11.00 пісалі літары. Пасля абеду было чытанне (па літарах). Школу наведвалі 18 вучняў.

Спачатку было першае аддзяленне. Пасля таго, як навучыліся чытаць па складах, чытаць словы, пачалі задаваць урокі на дом. У 1911 годзе школу наведвалі пяць вучняў: тры хлапчукі, адзін з якіх яўрэй, і дзве дзяўчыны (адна яўрэйка і сястра Аляксандры Чурко). Яўрэйку звалі Ленінберг Двеіра Калмонаўна. Першыя вучні Браткоўскі Гувім Хаймовіч, Ермаковіч Якаў Васільевіч, Ліхтар Фама Паўлавіч.

У 1911 годзе прайшлі “Буквар”. У 1912 годзе выдалі кнігу “Первые семена” і задачнік (1 частка , выданні Канавалава). Таксама ў 1912 годзе вывучалі “Закон Божы” і “Кароткі катэхізіс”. Пасля таго, як вывучылі 1 частку “Первые семена”, выдалі 2 частку. Гэта і было 2 аддзяленне.

У 1913 годзе выдалі “Гісторыю”, “Геаграфію”,”Часаслоў” і трэцюю кнігу “Добрых сямян”. Па гісторыі вывучалі жыццё князёў, цароў. “Часаслоў” быў на старaславянскай мове.

1914 год – год экзаменаў. Гэта было 3 аддзяленне. Экзамены былі па гісторыі, геаграфіі, па “Добрых семянах” і па “Закону Божаму”. Ездзілі здаваць у вёску Чучавічы ў сакавіку. Экзамен вытрымалі ўсе пяць вучняў, выдалася кожнаму “Пасведчанне” аб заканчэнні Гоцкага земскага сельскага вучылішча.




*Рыс. 2. Часаслоў вучэбны для пачатковых сельскіх вучылішчаў*

У 1915 годзе ў в. Гоцк прыслалі настаўніка, які навучаў ваеннай тактыцы, а пісьму і чытанню амаль не ўдзялялася ўвагі.

У 1916-1919 гг. не вучыліся: ішла вайна (Першая сусветная вайна (або Вялікая вайна; 28 ліпеня 1914 года - 11 лістапада 1918 года).

Пасля падпісання Рыжскага міру ў 1921 годзе наша вёска аказалася ў складзе польскай дзяржавы. Як і ва ўсім Палескім ваяводстве, непісьменнасць

у вёсцы з’яўлялася  адной з вострых сацыяльных праблем. Асвета на Палессі ў 1921 годзе была зусім на нізкім узроўні. Адсутнічала тут і разгалінаваная сетка школ. Адна пачатковая школа прыходзілася на 125 км² (самы нізкі паказчык у тагачаснай Польшчы). Нават тыя школы, што існавалі, не адпавядалі элементарным патрабаванням. З-за ваенных разбурэнняў стала складаным іх матэрыяльна-фінансавае становішча. Акрамя таго, востра адчуваўся недахоп настаўніцкіх кадраў. У 1921/22 навучальным годзе ў Палескім ваяводстве толькі 10% настаўнікаў мелі адпаведную кваліфікацыю. Улічваючы такі стан адукацыі на Палессі, на польскія ўлады ўскладалася вялікая адказнасць у справе ліквідацыі там непісьменнасці і малапісьменнасці, а таксама разгортвання сеткі навучальна-выхаваўчых устаноў.

І, менавіта, ужо ў 1923-1924 г.г. у Гоцку адкрылася польская пачатковая царкоўна-прыхадская  школа, і выкладалі ў ёй на польскай мове. Было два класы: першы і другі. У 1927 годзе пачалі будаваць новую школу – двухпавярховую. Яна адчыніла свае дзверы ў 1929 годзе. Было ў ёй чатыры класы, дзяцей навучалі ў дзве змены. Бяднейшым дзецям пры польскай уладзе выдавалі абеды. Кіраўніком школы быў Генрых Каспшык з Кракава. Акрамя яго, яшчэ працавалі два настаўнікі, якія выкладалі польскую мову, літаратуру і арыфметыку.

Наступны кіраўнік школы – Саверый Баранэк. Яго памочнікам быў Пшыбышэўскі.

У 1936 годзе кіраўніком школы становіцца Антон Дысек. А ў 1940 годзе яго змяніў настаўнік Яцко і дзве настаўніцы – яўрэйкі з Лунінца. Яны і вучылі дзяцей да пачатку вайны.

У 1942 годзе ў час Вялікай Айчыннай вайны пры нямецкай акупацыі забіралі дзяўчат і юнакоў у Германію. У 1943 годзе 15 лютага ў час аперацыі “Харнунг” немцы акружылі ўсю в. Гоцк і спалілі яе разам са школаю.

Восенню 1944 года пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў дзеці зноў маглі працягваць вучыцца. Ізноў загучалі дзіцячыя галасы. Школа была невялікая, таму што пабудавалі яе са зрубу хаты загінуўшага партызана Нагорнага Івана Дзмітравіча. Дырэктарам школы быў Апташкевіч Уладзімір Антонавіч. У “новай” школе зрабілі скамейкі, і дзеці пачалі вучыцца. Ручак не было. Іх падабенства рабілі са сцяблоў крапівы, замест чарнілаў пісалі сажаю, якую разводзілі з вадой. Вучыліся па “Буквары”, а потым па вучэбніках “Роднае слова”, Задачнік”. На пяць вучняў адзін вучэбнік.



Рыс. 3. Першая школа ў будынку хаты Нагорнага І. Д.

Працавалі ў школе дзве настаўніцы. На жаль, прозвішчаў іх ніхто не памятае. Вядома толькі, што адну звалі Кацярына Еўстратаўна, а другую –

Лідзія Мікалаеўна. Адначасова навучанне вялося ў звычайных хатах – у Базылёвай, Фесінай, Дзямідавай, Кузьміных. Пазней працавалі пачатковыя класы на хутарах Зарэчча, Паграбы, Апаленская.

У 1946 годзе дырэктарам школы быў Якушаў Уладзімір Паўлавіч. Яго жонка, Якушава Настасся Мітрафанаўна, выкладала мову. Завучам быў Жук Барыс Васільевіч, які выкладаў матэматыку. Яго жонка, Жук Настасся Андрэеўна, таксама выкладала матэматыку. Нямецкую мову вяла Фралова.

У 1947 годзе пачалі будаваць новую школу. Збудаваўшы адзін вугал, дзеці перайшлі ўжо сюды вучыцца. Называлася яна Гоцкай пачатковай школай. Дырэктарам быў назначаны Некрашэвіч Барыс. Пасля чацвёртага класа здаваліся экзамены. У класах было па 15-20 чалавек. Чацвёртых класаў было два. К гэтаму часу пачалі пісаць касцянымі ручкамі, макаючы імі ў чарнілы рознага колеру. Кожная настаўніца была замацавана толькі за адпаведным класам. Парты высокія, драўляныя, непафарбаваныя. У школе было пяць печак.



***Рыс.4. Гоцкая пачатковая школа, 1947 год, 1 і 2 класы***

У 1947 годзе дадаткова на хутары Падляскі была адкрыта школа для пражываючых на гэтым хутары дзяцей. Першы год дзеці хадзілі ў школу толькі па месяцы: адзін месяц восенню і адзін вясною, так як не было абутку. У класе было да 15 вучняў. Хадзілі ў дзве змены. Адна настаўніца Раўковіч Ганна вучыла ўсіх і адказвала за ўсё. Пісалі пер’ямі.

У 1950 годзе школа набыла статус сямігадовай школы. Пры школе быў адкрыты інтэрнат для дзяцей з хутара, дзе яны заставаліся начаваць.

У 1954 годзе прыехалі працаваць у школу Філітарава Лідзія Рыгораўна, Багуцкая Марыя Кірылаўна, Шыкуць Зінаіда Мікалаеўна. Яны засталіся жыць у Гоцку і працаваць у Гоцкай школе. Вышлі тут жа замуж.

У 1955-1956 г.г. дырэктарам школы працуе Ачапоўскі Н.В., у 1957-1961 г.г. – Шаўчук Мікалай Антонавіч.

І толькі ў 1962 годзе была пабудавана двухпавярховая школа з белай цэглы, дырэктарам якой быў прызначаны Шумчэня Уладзімір Паўлавіч. Тут можна было атрымаць васьмігадовую адукацыю.

У 1963 годзе пачатковыя школы на хутарах былі закрыты, і ўсе вучні пайшлі ў сярэднюю адзінаццігадовую школу. 29 кастрычніка 1963 года яна атрымала атрыбуты навучальнай дзяржаўнай установы – пячаткі і штампы. Такім чынам можна зрабіць выснову, што Гоцкая школа, як сярэдняя, стала існаваць з 29 кастрычніка 1963 года.

З 1964 года ў Гоцкай сярэдняй школе быў нават свой бухгалтар.

З 1965 года школа перайшла  на дзесяцігадовае навучанне. З гэтага ж году з-за вялікай колькасці вучняў навучанне стала весціся ў дзве змены. Гэта было вельмі нязручна і для настаўнікаў, і для вучняў, але школа магла змясціць толькі 350 рабят. А іх налічвалася ў той час 620. Напаўняльнасць класаў была вялікая (ад 25 да 32 дзяцей у класе). Некаторыя мелі чатыры паралелі.

З 1966 году па 1967 год дырэктарам Гоцкай сярэдняй школы становіцца Коўганаў Іван Уладзіміравіч. Пры школе стала працаваць сталовая. У 1973 годзе школа мела сваю машыну – ГАЗ-63, шафёрам на якой працаваў Грудзько Пётр Рыгоравіч.

У 1968-1970 г.г. дырэктарам Гоцкай сярэдняй школы была Скарабагатава Юзэфа Лаўрэнцьеўна, у 1971-1974 г.г. – Мілашэўскі Іван Іванавіч, у 1975-1976 г.г. – Вяршок Аляксандр Яўгенавіч З 1977 года па 1990 год



*Рыс. 5. Будынак двухпавярховай школы з белай цэглы, 1985 год*

Гоцкую сярэднюю школу ўзначальвае Кананові Сцяпан Адамавіч – наш зямляк, які ўсё сваё жыццё прысвяціў школе і вучням. У 1969 годзе скончыў Гоцкую сярэднюю школу. Паспяхова здаў ўступныя экзамены і паступіў ў Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага (МДПІ) (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (БДПУ) на фізічны факультэт. У 1974 годзе вярнуўся ў родную вёску і пачаў працаваць настаўнікам фізікі ў Гоцкай сярэдняй школе. Сямнаццаць год адпрацаваў настаўнікам, трынаццаць з якіх – дырэктарам. А потым пераехаў у Хатляны, што на Уздзеншчыне. Там таксама працаваў у Хатлянскай сярэдняй школе. Вось такі ён быў просты чалавек, біяграфія якога, як жартаваў ён сам, умяшчалася ў двух радках: “Дзве школы – усё жыццё!”




**Рыс. 6. Першы выпуск вадзіцеляў транспартных сродкаў катэгорыі “С” Гоцкай сярэдняй школы, 1983 год**

Сцяпан Адамавіч на сваім педагагічным шляху перажыў шмат рэформ і перамен.Разам з усімі марыў аб новай вялікай школе. Яе пачалі будаваць у 1985 годзе.

Разлічана яна на 784 навучэнцы. 31 жніўня 1986 года "новая" школа адчыніла свае дзверы для 581 вучня. У старым будынку школы размясціўся вучэбна-вытворчы камбінат, а з 1989 года яго ператварылі ў філіял Старобінскага вучэбна-вытворчага камбіната, дзе навучалі спецыяльнасцям шафёра і швачкі.

1991-1992 г.г. – дырэктарам Гоцкай сярэдняй школы з'яўляецца Жаўнераў Генадзь Афанасьевіч.



*Рыс. 7. Будынак "новай" школы, 1986 год*

З 11 студзеня 1993 года па 2013 год Ванкевіч Тамара Уадзіміраўна была больш як дваццаць гадоў нязменным дырэктарам школы. Яна ўзначальвала калектыў, які за гады яе кіраўніцтва дасягнуў добрых вынікаў як у навучанні падрастаючага пакалення, так і выхаванні.



*Рыс. 8. Тамара Уладзіміраўна Ванкевіч з педкалектывам, 1995 год*

Настаўнік, завуч, дырэктар – гэтыя ступені педагагічнай кар'еры прайшла яна за трыццаць пяць гадоў працы ў школе. Мала хто можа пахваліцца такой адданасцю прафесіі, школе, калектыву, вёсцы, якія сталі роднымі. Тут быў пачатак, і тут прыйшоў поспех.

Сярэдняя школа г.п. Чырвоная Слабада, педагагічны інстытут і зноў сярэдняя школа, толькі ў в. Гоцк. Тут у 1977 годзе пачыналася педагагічная дзейнасць Тамары Уладзіміраўны, якая разам з мужам, маладым спецыялістам

Леанідам Станіслававічам Ванкевічам, прыехала на працу па размеркаванню. Вучыла матэматыцы, была класным кіраўніком.

Хутка прыйшлося асвоіць і кіруючую пасаду: неардынарную маладую настаўніцу заўважылі ў школе і ў аддзеле адукацыі раёна і праз два гады прызначылі завучам школы. Разам з дырэктарам Сцяпанам Адамавічам Канановічам узначалілі сельскую школу, ствараючы калектыў аднадумцаў.

Школа пад кіраўніцтвам Тамары Уладзіміраўны змянілася. Пра гэта сведчаць Дыпломы I ступені ў раённай алімпіядзе сярод сельскіх школ. У алімпіядах па працоўнаму навучанню школа штогод была ў ліку прызёраў.

Добраўпарадкаванне тэрыторыі школы, яе інтэр’ер – плён фантазіі



Рыс. 9. Тамара Уладзіміраўна і педкалектыў, 2012 год

дырэктара.

Фарміраванню патрыятычных якасцяў вучняў дапамагае дзейнасць школы ў рамках сацыяльна-педагагічнай мадэлі “Этнашкола”, кіраўніком якой з’яўляецца Тамара Уладзіміраўна.

Пасля адыходу на заслужаны адпачынак Ванкевіч Т.У. у 2013 годзе педагагічны калектыў узначаліла Ермаковіч Валяціна Віктараўна. Усю сваю педагагічную дзейнасць Валянціна Віктараўна прысвяціла адной школе, у якой выхавала не адно пакаленне юнакоў і дзяўчат.

Скончыўшы ў 1987 годзе Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага (МДПІ) (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (БДПУ), была накіравана на працу ў Гоцкую сярэднюю школу

настаўнікам пачатковых класаў. Па 1998 год настаўніца вучыць пазнанню, увазе, далікатнасці, разуменню прыгажосці пачаткоўцаў. Лічыць,што самыя адказныя для выхавання – гэта пачатковыя класы.

Прафесійныя поспехі, адказнасць, працаздольнасць Валянціны Віктараўны былі заўважаны кіраўніцтвам школы і раённага аддзела адукацыі. У 1998 годзе яна назначаецца на пасаду намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце. З уласцівымі для яе энтузіязмам, зацікаўленасцю і зацятасцю, Валянціна Віктараўна ўзялася за працу.

Зараз школа жыве сваім кіпучым жыццём. Кіраўніком яе з'яўляецца Ермаковіч Валянціна Віктараўна, а намеснікамі дырэктара – Вялько Людміла Мікалаеўна і Даліда Людміла Міхайлаўна. Вучні ўдзельнічаюць у раённых, абласных, рэспубліканскіх спаборніцтвах, конкурсах, у алімпіядах. Установа адукацыі з году ў год з'яўляецца лаўрэатам конкурсу "За дасягненне высокіх паказчыкаў у развіцці адукацыі" у намінацыі "Лепшая ўстанова агульнай сярэдняй адукацыі, размешчаная ў сельскай мясцовасці".



*Рыс 10. Валянціна Віктараўна Ермаковіч і педагагічны калектыў, 2020/2021 навучальны год*

Быць дырэктарам школы – значыць цалкам прысвяціць сябе працы. Бо ўсе клопаты і правільныя рашэнні кладуцца на яе плечы. Валянціна Віктараўна клапоціцца як аб вучнях, так і аб калектыве. Дырэктар школы – адказная і складаная праца. Бо трэба быць у курсе ўсіх падзей жыцця школы кожны дзень.

Добрыя традыцыі школы працягвае Валянціна Віктараўна разам з вучнёўскім і педагагічным калектывамі. Нам удаецца не толькі правільна захаваць усё лепшае, але і адкрываць новыя старонкі, якімі па праве можа ганарыцца наша самавітая і вечна юная Гоцкая сярэдняя школа.